**І. В. Казакова**

УДК 39 (=161.3):633.88+398.32(=161.3):58

Кафедра гісторыі беларускай літаратуры, філалагічны факультэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

# НАРОДНАЯ ФІТАТЭРАПІЯ І ЧАРОЎНЫЯ ЯКАСЦІ РАСЛІН У СВЯДОМАСЦІ НАШЫХ ПРОДКАЎ

У артыкуле разглядаюцца народныя прыкметы і павер'і, звязаныя з раслінамі, уласцівасці лекавых раслін і іх выкарыстанне ў народнай медыцыне.

**Ключавыя словы:** народныя прыкметы і павер'і, лекавыя расліны, народная медыцына.

**Узор цытавання:** Казакова І. В. Народная фітатэрапія і чароўныя якасці раслін у свядомасці нашых продкаў // София: электрон. науч.-просветит. журн. 2021. № 2. С. 59–64.

**I. Kazakova**

Department of history of belarusian literature, faculty of philology, Belarusian State Unversity, Minsk, Belarus

# TRADITIONAL HERBAL MEDICINE AND MAGIC PROPERTIES OF PLANTS IN THE MINDS OF OUR ANCESTORS

The article discusses folk signs and beliefs associated with plants, the properties of medicinal plants and their use in folk medicine.

**Keywords:** folk signs and beliefs, medicinal plants, folk medicine.

**For citation:** Kazakova I. (2021). Traditional herbal medicine and magic properties of plants in the minds of our ancestors. Sophia, 2, 59–64 (in Belar.).

**Аўтар:**

**Ірына Валер'еўна Казакова** – доктар філалагічных навук, прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ.
*irina_sml@bk.ru*

**Author:**

**Iryna Kazakova** – doctor of philological sciences, professor of the department of history of belarusian literature, BSU.



Лекавыя якасці раслін здаўна выкарыстоўваліся ў народнай медыцыне. Расліны дапамагалі нашым продкам не толькі вылечваць хваробы, але былі таксама моцнымі абярэгамі ад усялякага зла. Напрыклад, такія расліны, як палын і часнок зберагаюць ад нячыстай сілы, лаванда ахоўвае сон, рамонак дапамагае захаваць спакой і г. д.

Многія павер'і распавядаюць пра тое, што асаблівую чароўную сілу расліны набываюць напярэдадні Купалля. Моцны водар лясных і палявых траў і кветак, зёлак,

іх чароўныя якасці ўзмацняюцца ў гэтую незвычайную пару. Знахар, які ў гэты час накіроўваеца збіраць зёлкі, па павер'ях, павінен сабраць не менш ста траў.

Знахары і знахаркі ведалі шмат лячэбных замоў, розныя сакрэты народнай медыцыны, нават валодалі экстрасэнсорнымі магчымасцямі. Яны вельмі ўмела маглі выправіць звіх, зняць павышаны ціск, суцешыць галаўны і зубны боль, а таксама зменшыць боль пры родах, выкарыстоўваючы спецыфічны масаж пэўных участкаў цела, што і сёння практыкуецца спецыялістамі мануальнай тэрапіі.

Народныя лекары добра ведалі магічныя якасці раслін, інакш – фларамансію. Наогул, вывучэнне ўласцівасцей і ўздзеянняў на чалавека, збіранне і прыгатаванне лекавых траў займае ў культуры многіх народаў свету вельмі значнае месца. А астралогія абавязкова ўлічвае суадносіны траў і планет. Напрыклад, мята і блёкат прысвечаны Юпітэру; цыбуля, гарчыца, малачай – Марсу; сланечнік, півоня, чыстацел, грэчка – Сонцу; ружа і папараць – Венеры; іван-ды-мар'я, арэшнік – Меркурыю; белы гарлачык – Поўні і г. д. Прынята і больш агульнае суаднясенне: плады – Юпітар, кветкі – Венера, насенне і кара – Меркурый, карані – Сатурн, ствол – Марс, лісце – Поўня, уся расліна цалкам – Сонца.

Лекавыя расліны трэба збіраць у пэўны час з уменнем і руплівасцю, таму што іх уздзеянне і якасць залежаць менавіта ад правільнасці збору. Трэба збіраць толькі здаровыя расліны ў поўным саку і развіцці, інакш з лекаў яны ператвараюцца ў атруту.

У народзе існуюць павер'і, што травы «слухаюцца» не ўсіх людзей. Лічыцца, што каб лячыць травамі (і іншымі раслінамі), трэба мець пэўныя здольнасці, якія ёсць далёка не ва ўсіх. Часцей за ўсё травы раскрываюць свае таямніцы жанчынам, як істотам больш блізкім да прыроды, найбольш арганічна звязаным з яе сіламі, з таямніцай з'яўлення новага жыцця. Жанчыны-знахаркі пры дапамозе лекавых раслін ратавалі людзей ад самых розных хвароб. Напрыклад, суцяшалі зубны боль адварам шалфею або настоем лісцяў маліны і мяты, сокам рэдзькі з малаком і мёдам вылечвалі кашаль. Бабулі-знахаркі добра ведаюць, што настой палыну з гарэлкай дапамагае вылячыцца ад малакроўя, худасочнасці. Запараная крапіва таксама лечыць малакроўных. Сок свежай рабіны і адвар святаянніку добра лечаць гемарой; настой з лісця крапівы на гарэлцы загойвае раны; канаплянае семя з малаком ратуе ад камянёў у нырках і печані; капусныя лісты, прыкладзеныя да ілба, здымаюць галаўны боль; тым, у каго хворае сэрца, рэкамендуецца піць некалькі разоў на дзень чай з кветак фіялак. Пры дапамозе кары ясеня зводзяць барадаўкі. Морква, рэпа, буракі дапамагаюць пры лячэнні мужчынскай палавой слабасці; кара дуба, сок з лісця крапівы ці каліны дапамагае пры жаночых захворваннях. Пры хваробах крыві дапаможа пятрушка, яблыкі карысныя пры падагры і праблемах з сасудамі. Многія сакрэты народных знахараў з поспехам выкарыстоўваюць і сучасныя медыкі.

Здаўна людзі надавалі розным раслінам пэўныя сімвалічныя значэнні. Так, напрыклад, дуб з'яўляецца эмблемай сілы, лілія – чысціні, гарчыца – усёведання, мак – ляноты, яблыня – спакусы, барвінак – добрых успамінаў, фіялка – сціпласці, крапіва – сладастраснасці, пралеска – суцяшэння, ружа – кахання і г. д.

Каб так ці інакш уздзейнічаць на чалавека, прывесці яго ў патрэбны стан ці выклікаць пэўныя пачуцці, умела карысталіся ўласцівасцямі розных раслін, але не толькі. Напрыклад, народная любоўная магія выкарыстоўвала для дасягнення сваіх мэтаў самыя розныя сродкі. Тут удзельнічала ўсё: расліны, металы, колеры і водары, ежа і пітво, сіла прыродных стыхій (зямлі, вады, паветра, агню), а таксама валасы, адзенне,

любыя рэчы той асобы, якую (ці да якой) трэба было «прысушыць» ці наадварот «адсушыць». З раслін і пладоў найбольшая роля адводзілася яблыкам і трыпутніку. Людзі верылі, што трыпутнік, як расліна Сонца, абуджае любоўны жар і ўмацоўвае каханне. Яблык здаўна звязваецца з матывам спакусы мужчыны жанчынай.

Нашы продкі лічылі, што зялёны, чырвоны, чорны колеры запальваюць каханне, а белы і сіні ахаладжаюць яго. Таму колер кветак улічвалі пры прыгатаванні «любоўных» напоеў. Так, пялёсткі чырвонай ружы лічыліся моцным афрадызіякам. Водары ружы, барвінка, гваздзіка ўздымаюць сексуальны настрой, а багун выклікае агіду.

У старажытныя часы на ўсходзе нашай зямлі верылі, што каб выклікаць каханне, трэба ўзяць кветку барвінка і некалькі пялёсткаў чырвонай ружы (або шыпшыны), высушыць іх на сонцы, перацерці ў парашок, а пераціраючы кветкі, трэба ўвесь час паўтараць: «Гэтым я закоўваю (імя дзяўчыны і імя жаніха) у залатыя цэпі, непарыўныя аковы любові і страсці». Потым гэты парашок трэба было дабаўляць у ежу і пітво чалавека, які павінен быў закахацца.

З раслінамі звязана шмат прыкмет і павер'яў. Напрыклад, лічылі, што нельга выпякаць хлеб, калі цвіце жыта, бо такі хлеб будзе плеснець. Такія прыкметы і павер'і часта былі заснаваны на рэальных фактах. Так, плесня на хлебе тлумачыцца асаблівым размнажэннем у гэты перыяд лета пад уплывам стану атмасферы плесневых грыбкоў. Вядома, што ў час цвіцення жыта хутка псуецца віно, у гэты ж час нельга выбельваць палатно, а плямы на бялізне адмываюцца хутчэй. Цікавае таксама назіранне з жыццёва-практычнага вопыту: калі збажына пачынае красаваць знізу, то будзе збожжа каштаваць танна, калі ж зверху – дорага. Іншымі словамі, здаровы колас звычайна пачынае красаваць знізу, тады трэба разлічваць на добры ураджай і, адпаведна, танны хлеб. Народная прыкмета гаворыць, што калі сабакі пачынаюць есці траву, то хутка будзе дождж. І гэта сапраўды так, бо перад дажджом трава становіцца для іх самай карыснай у плане насычэння спецыфічнымі мікраэлементамі.

Па надвор'і нашы продкі імкнуліся прадказаць, ці добры будзе ўраджай, чаго на наступны год вырасце больш. Лічылі, што калі першы дзень Каляд будзе ясны, то не будзе добрага ўраджаю. А калі будзе пахмурна ці пойдзе снег, то год будзе ўраджайны. Калі ў калядны вечар і ноччу на небе шмат зорак – летам будзе шмат грыбоў, а калі ў другой палове дня на першы дзень Каляд будзе град, то вялікі ўмалот дасць гарох. Калі на Дабравешчанне будзе дождж, то будзе добры ўраджай на жыта.

Па некаторых прыкметах па раслінах, наадварот, меркавалі пра надвор'е. У нашых вёсках і сёння лічыцца, што шмат жалудоў на дубах прадказваюць халодную зіму і добры ўраджай на наступны год. Рана расквітнеўшая вольха прадвяшчае мокрае лета, ураджай арэхаў – да ўраджаю хлеба на будучы год, ураджай рабіны – да цяжкога года.

Каб было шчасце, здароўе і дабрабыт, трэба было ўпрыгожваць свае хаты і знутры, і звонку зялёнымі галінамі бярозы і іншай зелянінай на Духаў дзень, Святую Троіцу, Сёмуху. У беларусаў вестуном вясны лічыцца вярба. Асвечаныя ў храме галінкі вярбы прыносілі на Вербніцу дадому і пахлопвалі імі сваіх сямейнікаў, каб яны ўвесь год былі здаровыя.

Прыкметы і павер'і, звязаныя з раслінамі, тычыліся самых розных бакоў жыцця. Так, напрыклад, верылі, што нельга расціць фіялкі ў хаце, дзе ёсць незамужнія дзяўчаты, бо яны доўга не выйдуць замуж. Па павер'ях фіялкі таксама «выганяюць» з хаты мужыкоў. У нявесцін вянок абавязкова павінна была быць уплецена рута на шчасце. Калі дзяўчына саджала пад сваімі вокнамі чырвоны мак, гэтым яна прываблівала

хлопцаў. Калі з'есці кветку бэзу з пяццю пялёсткамі, то гэта прынясе шчасце. Бяроза, якая расце побач з домам, адганяе зло і аберагае ад маланкі. Лічаць, што калі хворага чалавека напаіць бярозавым сокам 11 мая (на Максімаў дзень), то ён абавязкова стане здаровым. Посаха з бузіны баяцца дзікія звяры. Каб урадзіўся добры лён, лічылі, што яго трэба сеяць голым, без адзення. Вольха зберагае ад сурокаў. А цяжарных жанчын ад сурокаў аберагае хмель, пакладзены ў абутак. Трава чарнабыльнік выратоўвае ад чарадзеяў і ад змей. А калі перад Купаллем надзець на галаву вянок з чарнабыльніку, тады не будуць балець вочы і галава. Вяргіні прывядуць да дзяўчыны жаніхоў. Астры дапамагаюць захоўваць душэўны спакой. Ружа ўзмацняе каханне.

Народная фітатэрапія захавала звесткі пра лекавыя расліны і іх якасці. Напрыклад, чарніцы – вельмі карысная ягада, якая не толькі добра ўплывае на зрок, але таксама з'яўляецца прыродным антыбіётыкам і антысептыкам. Яна лечыць кашаль, запаленне горла, праблемы са страўнікам, рэгулюе фізіялагічны цыкл у жанчын. У народнай медыцыне выкарыстоўваюцца не толькі ягады чарніц, але і лісце.

Аслабленым, хворым давалі піць адвар шыпшынніка. Сёння мы дакладна ведаем, як добра гэта расліна ўздымае імунітэт, бо ў ягадах шыпшынніку шмат вітаміна С. Таксама шыпшыннік змяншае крывацёк, загойвае раны.

Цікава, што наша звычайная бульба – не толькі смачная ежа, але таксама вельмі моцны лекавы сродак. З дзяцінства мы памятаем, што калі з'яўляўся насмарк, нас прымушалі дыхаць парам над зваранай бульбай, калі быў кашаль, тады на грудзі клалі кампрэс з размятай варанай бульбы. Але народныя знахары выкарыстоўвалі бульбу ў лекавых мэтах значна шырэй. Часта прымянялі бульбяны адвар. Такім адварам лячылі розныя праблемы страўніка. Ён добра ўплывае на косці і суставы, на сэрца і сасуды, паляпшае імунітэт, з'яўляецца натуральным мачагонным сродкам. Спецыяльна прыгатаваны жывы бульбяны квас мае моцны бактэрыцыдны эфект.

У старажытныя часы галоўнымі «біядабаўкамі» заўсёды былі цыбуля і часнок. Здаўна часнок быў адным з самых моцных лекавых сродкаў ад розных хвароб. Ён выкарыстоўваўся ў народный медыцыне ў многіх краінах свету. Напрыклад, у Індыі часнаком лячылі астму, у Германіі – сухоты, французы выкарыстоўвалі яго пры вірусных захворваннях, а італьянцы і іспанцы – пры хваробах страўніка, афганцы лічаць, што ён дапамагае ад стомленасці і слабасці. Часнок – гэта таксама і глістагонны сродак, і сродак паніжэння ціску і халестэрыну, і абаронца працы мозгу.

Цыбуля таксама была са старажытнасці не толькі прадуктам харчавання, але і лекавым сродкам. Яе ўжывалі ў старажытным Егіпце, Старажытнай Грэцыі і Рыме, на Бліжнім Усходзе і інш. Цыбуля выкарыстоўваецца супраць рознага кшталту запаленняў, для агульнага ўмацавання арганізма, дапамагае пры прастудах, дзейнічае як паслабляльны сродак, для паніжэння цукру ў крыві, для паляпшэння стану скуры, умацоўвае зубы і дзёсны, настой цыбулі карысны пры алергіях.

Універсальным сродкам у народнай медыцыне з'яўляецца рэдзька. Сок рэдзькі з мёдам лечыць бранхіты, дапамагае пры болях у суставах, загойвае раны і драпіны. Рэдзька ўтрымлівае шмат вітамінаў, а таксама калій, натрый, магній, кальцый, жалеза.

Нашы продкі здаўна добра ведалі лекавыя якасці хрэна. Сучасныя медыкі таксама, як некалі нашы бабулі, раяць нюхаць нацёрты хрэн для павышэння імунітэту. Сок хрэна лечыць ангіну, запаленне вушэй, зубны боль. Хрэн спыняе рост бактэрый, дапамагае вылечваць хваробы сістэмы мочавыдзялення. Сучасныя даследаванні сведчаць,

што хрэн дапамагае лячыць нават анкалагічныя хваробы, паказаны пры радыкулітах, паталогіях суставаў, неўралгіях. Таксама хрэн садзейнічае пахудзенню.

Шмат лекавых уласцівасцей мае лопух. Адварам з каранёў лопуха лячылі ў старажытнасці венерычныя захворванні, хваробы суставаў. Калі балела галава, абавязкова прыкладалі лопух, ён вылечваў нават моцныя мігрэні. Лопух лечыць фурункулёз, экзэму, гемарой, дапамагае пры запорах. Корань лопуха мае антыалергічныя, антымікробныя, антысэптычныя ўласцівасці, таксама зніжае ўзровень цукру ў крыві.

Нашы продкі, таксама як і мы, перажывалі нярвовыя і стрэсавыя сітуацыі і добра ведалі, якія расліны дапамагаюць у такіх выпадках. Першае месца тут належыць, безумоўна, вяляр'яну лекаваму. Гэта расліна ўздейнічае заспакаяльна на цэнтральную нервовую сістэму, паляпшае сон, валодае спазмалітычнымі ўласцівасцямі. Карнявішчы валер'яна дапамагаюць пры захворваннях шчытападобнай залозы, эпілепсіі, астме і інш.

Заспакаяльным эфектам валодае і мята перцавая. Яна аказвае спазмалітычнае, супрацьзапаленчае і жаўцягоннае ўздзеянне. Завараная ў выглядзе чаю, мята суцяшае боль пры захворваннях страўніка, кішэчніка, печані і жоўцевага пузыра. У выглядзе настояў мята дапамагае пры млоснасці, ванітах, спыняе ікаўку, паляпшае работу страўнікава-кішэчнага тракту. Мята выкарыстоўваецца таксама пры гіпертанічнай хваробе, атэрасклерозе, ныркакаменнай хваробе і інш. Раней у вёсках жанчыны клалі лісце мяты ў малако, каб яно не скісала. Мята ўваходзіць таксама ў розныя травяныя зборы, здаўна выкарыстоўваецца ў кулінарыі як прыправа.

У народнай медыцыне ў якасці заспакаяльнага сродку ўжываўся таксама хмель. Шышкі хмелю аказваюць заспакаяльнае, мачагоннае, супрацьзапаленчае, болесуцяшальнае ўздзеянне. Настой хмелю ўзбуджае апетыт, дапамагае пры неўрозах, бяссонніцы, цыстыце, клімактэрычных праблемах.

Смачная вішня, якую мы так любім есці, таксама з'яўляецца лекавай. Плады вішні валодаюць паслабляльным, супрацьліхаманкавым, антысептычным, адхаркваючым дзеяннем. Вішня паніжае ціск, павышае гемаглабін, добра ўздзейнічае на сасуды. Адвары са свежага лісця вішні дапамагаюць ад жаўтухі. Настоі і адвары пладаножак вішні дзейнічаюць як мачагонны, спазмалітычны, супрацьзапаленчы сродак, а тасама акзваюць вяжучае ўздзеянне. Настоямі з вішні раней лячылі дыятэз. Вішню давалі есці дзецям і цяжарным жанчынам, каб засцерагчы іх ад малакроўя.

Прыгожы майскі ландыш дапамагае пры сардэчных захворваннях. Духмяны кроп вывратоўвае ад высокага ціску і лечыць запаленні мачавога пузыра, садзейнічае павелічэнню малака ў жанчын, якія кормяць грудзямі. Маленькім дзеткам даюць кропавую вадзічку пры ўздуцці жывата і кішэчных коліках. Барбарыс у народнай медыцыне выкарыстоўваўся пры маточных крывацёках, запаленчых працэсах маткі, асабліва ў пасляродавым перыядзе.

Свяшчэннае дрэва славян – дуб, таксама зрабіў свой унёсак у народную аптэку. Кара дуба валодае вяжучымі, дубільнымі якасцямі. Адвары кары дуба маюць супрацьзапаленчыя, супрацьгніласныя ўласцівасці, дапамагаюць пры атручэннях, паносах, страўнікавых і кішэчных крывацёках, захворваннях ротавай поласці. Кара дуба выкарыстоўваецца пры лячэнні апёкаў, захворванняў скуры, пролежняў, дапамагае пры вагінальных запаленчых захворваннях.

Усім вядомы сціплы дзьмухавец таксама не застаўся ў баку ад дапамогі людзям пры захворваннях. Дзьмухавец узбуджае апетыт, паляпшае дзейнасць страўнікава-кішэчнага тракту. Адвары з яго каранёў выкарыстоўвалі пры захворваннях печані, жоўцекаменнай

і ныркакаменнай хваробах, гемароі, захворваннях скуры. Настой кветак дзьмухаўца карысны пры рэўматызме, а адвар – пры бяссонніцы і бранхітах. Увесну, каб падтрымаць арганізм, аслаблены за зіму, нашы бабулі рыхтавалі салаты са свежага лісця дзьмухаўцоў, з лісця крапівы і трыпутніку.

Назапашаны за стагоддзі вопыт народнай медыцыны сёння атрымаў новае жыццё ў афіцыйнай медыцыне. Сёння фітатэрапія дапамагае пры лячэнні розных захворванняў, і часам лячэнне прыроднымі сродкамі дае лепшыя вынікі, чым пры медыкаментозным лячэнні, таму што амаль не мае пабочных эфектаў.

Шчыры дзякуй народу, які захаваў свой вопыт, свае веды, невычарпальныя скарбы таямніц прыроды, бяздоннае багацце роднай зямлі!